РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ПАМІ́НКІ**, абрады ўшанавання памяці памерлага чалавека; звязаны з *культам продкаў* і верай у замагільнае існаванне. Звычайна П. адбываліся ў доме, дзе памёр чалавек, адразу пасля *Пахавання* і ў наступныя пасля смерці дні: 3-і (Траціны), 9-ы (Дзевяціны), зрэдку 20-ы (Паўсарачыны), 30-ы (у католікаў), 40-ы (Сарачыны), паўгодкі. Цыкл П. па нябожчыку завяршаўся гадавінай яго смерці. Затым ішлі агульныя П. ў кожную пару года па ўсіх памерлых родзічах — *Дзяды*. На першыя П. запрашалася ўся радня і ўдзельнікі Пахавання, на наступныя — блізкія сваякі, таксама маглі прысутнічаць святар, старцы. У правядзенні П. назіраліся язычніцкія (*галашэнні*) і хрысціянскія (чытанне малітваў, запальванне свечак) традыцыі. Жалобны стол пачынаўся звычайна з *куцці* або *кануна*, які кожны браў з агульнай міскі па тры лыжкі. У залежнасці ад мясцовых традыцый на П. спажывалі розныя рытуальныя стравы: клёцкі, боб, гарачы хлеб, які трэба было разрываць рукамі, цёрты мак у малацэ і інш., таксама пілі гарэлку. Асобную чарку, як і талерку з ядою, ставілі для нябожчыка, каб душа яго, пачаставаўшыся, у наступным спрыяла тым, хто застаўся пасля яго ў хаце і на гаспадарцы. Акрамя жалобнага стала ў хаце, П. праводзіліся і на *могілках*. У наступны дзень пасля пахавання блізкія ішлі «будзіць нябожчыка» на яго магілу, дзе падпраўлялі насып, паміналі, галасілі. Месцамі захаваліся памінальныя звычаі *Асяніны, Прыкладзіны*. У гэты дзень упарадкоўвалі магілу — абкладвалі яе дзёранам. Тое ж рабілі і ў інш. поры года — на *Радаўніцу* (на большасці тэрыторыі Беларусі) і напярэдадні *Сёмухі* (на ўсходзе Беларусі). Традыцыйны абрад П. захоўваецца і ў наш час.

*Літ.*: Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. Мн., 1986.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ